Пілігрымкі

Аўтар: Рэдакцыя
25.07.2013 01:00



Экуменічная пілігрымка Беласток – Гродна – Вільня

З **16 па 25 жніўня** ладзіцца XXI Экуменічная пешая пілігрымка да Вастрабрамскай Маці Божай Міласэрнасці пад дэвізам “З верай праз жыццё”.

16 жніўня пілігрымы вырушаць з Беластока пасля св. Імшы, якая адбудзецца ў 5.30 раніцы ў беластоцкай архікатэдры.

18 жніўня пілігрымка прыйдзе ў Гродна, дзе ў пабернардынскім касцёле Адшукання св. Крыжа пілігрымы прымуць удзел у св. Імшы, пасля якой разыдуцца на адпачынак па гасцінных гродзенскіх сем’ях.

19 жніўня пасля св. Імшы, якая будзе цэлебравацца ў 7.30 раніцы ў пабернардынскім касцёле, пілігрымка вырушыць да сваёй мэты разам з мясцовымі гродзенскімі пілігрымамі.

Планаваны прыход у Вільню – **24 жніўня** (св. Імша а 16-й гадзіне).

Урачыстае завяршэнне пілігрымкі адбудзецца **25 жніўня** малітвай св. Імшы у Вастрабрамскім санктуарыі.

Ад пілігрымаў патрабуецца мець у пашпарце дзейсную візу Шэнген.

Дадатковыя пытанні, звязаныя з удзелам у пілігрымцы, неабходна кіраваць да кс. Алега Канановіча, дыяцэзіяльнага мадэратара пілігрымкі Беласток – Гродна – Вільня па тэл.: +375 29 88 94 366.